WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 СТУДЗЕНЯ 2011 г. ПЯТНІЦА № 12 (26876)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Надвор'е

## НА ВЫХАДНЫЯ СНЕГ І МАРАЗЫ

**СЁННЯ тэрыторыя краіны застанецца ў зоне паніжанага ціску, таму на большай частцы краіны будзе ісці снег, мокры снег, а ўначы і раніцай месцамі па Гомельскай вобласці — моцны мокры снег, паведаміла рэдакцыі начальнік аддзела метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.**

Уначы і раніцай на паўднёвым усходзе рэспублікі месцамі туман. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература на працягу сутак 0—мінус 7, уначы на поўначы пры праясненнях — да 9 градусаў марозу.

У суботу і нядзелю на тэрыторыю Беларусі завітае больш халоднае паветра з боку Скандынаўскага паўвострава. Таму на выхадныя да нас зноў вернецца сапраўдная зіма. Усюды па краіне пройдзе кароткачасовы снег. У асобных раёнах слабы туман. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад 4 да 11 марозу, пры праясненнях да мінус 13 градусаў, удзень — 2—9 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Удзел у інаўгурацыі Прэзідэнта Беларусі пацвердзілі 32 кіраўнікі замежных дыпмісій і прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый

Удзел у цырымоніі інаўгурацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, якая адбудзецца сёння, пацвердзілі 32 кіраўнікі замежных дыпламатычных устаноў і прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных.

## З БЕЛАРУССЮ НІКОМУ НЕ БУДЗЕ ДАЗВОЛЕНА ГАВАРЫЦЬ З ПАЗІЦЫІ СІЛЫ І НА МОВЕ ЎЛЬТЫМАТУМАЎ

**На нарадзе 20 студзеня па некаторых унутрыпалітычных пытаннях Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці ў выпадку ўвядзення супраць Беларусі якіх-небудзь санкцый падрыхтаваць меры ў адказ. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Адкрываючы нараду, Прэзідэнт адзначыў, што напярэдадні былі разгледжаны праблемныя пытанні эканамічнай сітуацыі ў Беларусі. «Ёсць неабходнасць сёння абмеркаваць палітычныя пытанні бягучага моманту. І эканамічныя, і палітычныя пытанні, і многія іншыя ў нас вызначаны, — сказаў ён. — Я хачу яшчэ раз падкрэсліць, што ўсе праграмы і напрамкі дзеянняў вызначаны, удакладнены і не могуць быць ніякім чынам перапрацаваны. Таму што няма той сітуацыі, якая дыктавала б нам неабходнасць нейкіх карэкціровак або карэкцый курсу ў тым ці іншым напрамку».

«Нам трэба яшчэ раз усебакова ацаніць сітуацыю, якая склалася вакол нашай краіны, асабліва пасля прэзідэнцкіх выбараў, і вызначыць нашы наступныя дзеянні. Вядома ж, мы не збіраемся хаваць праблемы, якія, магчыма, могуць узнікнуць у сувязі з падзеямі ночы 19 снежня», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ніхто з тых, хто ў курсе гэтых падзей, «не сумняваецца ў тым, што супраць нашай дзяржавы была арганізавана змова».

«Спансіравалі яе замежныя спецслужбы, а ролю выканаўцаў адвялі мясцовым адшчапенцам і жулікам ад палітыкі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Вы, напэўна, звярнулі ўвагу, як шалёна атакуюць Беларусь немцы і палякі. Усё вельмі проста, — адзначыў ён. — Я вымушаны сёння сказаць аб тым, што ўсе праграмы і вялікая частка грошай ішлі з Германіі і Польшчы або праз Германію і Польшчу. Там жа і пісаліся праграмы звяржэння канстытуцыйнага ладу. І гэта не выдумка спецслужбаў. Гэта паказанні тых, хто гэта арганізоўваў».

Як адзначыў Прэзідэнт, аб некаторых фактах, якія сёння можна абнародаваць у працэсе следства, СМІ ўжо расказалі беларускаму народу. «І гэта яшчэ не канец. І людзі з разуменнем паставіліся да дзеянняў улады, якая рашуча абараніла парадак і дзяржаўнасць», — сказаў ён.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што многія сёння спрабуюць абвінаваціць КДБ, МУС і ўвесь сілавы блок краіны ў тым, што яны нібыта дэзынфармавалі і падманулі Прэзідэнта. «Я папрашу ў сувязі з гэтым усім супакоіцца і зразумець адну рэч: першым, хто абараняе суверэнітэт і незалежнасць краіны і тую сістэму, якая функцыянуе, з'яўляецца Прэзідэнт. Ніякіх дзеянняў праваахоўныя органы не прымалі, не прымаюць і не будуць прымаць па навядзенні парадку ў краіне без санкцыі Прэзідэнта».

Тым не менш, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, нядобразычліўцы пачалі магутную атаку збоку, у замежных СМІ разгорнута шалёная інфармацыйная кампанія супраць Беларусі. «Нам пагражаюць санкцыямі (мы гэта ўжо чулі і перажывалі ў свой час, таму не буду падрабязна спыняцца): ці то блакаду аб'явіць, ці то яшчэ штосьці ізаляваць. Яшчэ раз падкрэсліваю: мы гэта праходзілі ўжо. Калі Еўропа, Амерыка і нехта яшчэ хоча наступіць другі раз на тыя ж граблі, гасподзь ім у дарогу».

СТАР. 2

## РАСІЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА СТРАТЭГІЧНЫМ ПАРТНЁРАМ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч у час перагавораў у Маскве з кіраўніком расійскага ўрада Уладзімірам Пуціным.**

«Для нашага ўрада Расійская Федэрацыя — стратэгічны партнёр, гэта адназначна», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Прэм'ер-міністр Беларусі падзякаваў ураду Расіі за праведзеную работу, якая зроблена ў Мытным саюзе. «Тое, што падпісаны ўсе базавыя дакументы, стварыла сур'ёзную аснову, каб рухацца наперад у стварэнні Адзінай эканамічнай прасторы», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Ён нагадаў, што Беларусь поўнасцю ратыфікавала ўсе дакументы па Адзінай эканамічнай прасторы, і выказаў надзею, што Расія і Казахстан у бліжэйшы час завершаць адпаведныя ўнутрыдзяржаўныя працэдуры.

«Неабходна стварыць увесь алгарытм, каб з 1 студзеня запусціць АЭП у поўным аб'ёме, — падкрэсліў прэм'ер-міністр Беларусі. — Самае галоўнае — стварыць роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання, інакш кажучы — роўныя ўмовы для іх канкурэнцыі».

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін выказаў удзячнасць Прэзідэнту і ўраду Беларусі за актыўную работу ў рамках Мытнага саюза і па фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы.

Прэм'ер-міністр Расіі канстатаваў, што беларуска-расійскі тавараабарот практычна вярнуўся на дакрызісны ўзровень.

«Самае галоўнае ў эканамічнай сферы супрацоўніцтва Беларусі і Расіі заключаецца ў тым, што расце тавараабарот, — сказаў Уладзімір Пуцін. — За студзень—лістапад 2010 года ён практычна вярнуўся на дакрызісны ўзровень. Агульны аб'ём тавараабароту за гэты перыяд склаў $25 млрд».

Уладзімір Пуцін адзначыў, што апераджальнымі тэмпамі растуць пастаўкі беларускай прадукцыі на расійскі рынак. Паводле яго слоў, гэты паказчык павялічыўся на 47 працэнтаў.

«Патэнцыял супрацоўніцтва высокі, нам будзе аб чым пагаварыць», — сказаў прэм'ер-міністр Расіі.

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч лічыць устарэлымі існуючыя паміж беларускімі і расійскімі суб'ектамі гаспадарання формы супрацоўніцтва.

«Усё ж такі формы супрацоўніцтва суб'ектаў гаспадарання старыя, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. — Трэба выходзіць на стварэнне буйных сумесных кампаній, навукова-вытворчых карпарацый. Магчыма, і з удзелам трэціх краін».

Прэм'ер-міністр Беларусі прапанаваў правесці чарговае пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы ў лютым-сакавіку ў Мінску.

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, у рамках Саюзнай дзяржавы назбіралася шмат пытанняў. Іх вырашэнне стала б прарывам і ў двухбаковых беларуска-расійскіх адносінах, адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі.

Уладзімір Пуцін падтрымаў ідэю аб правядзенні чарговага пасяджэння саюзнага Саўміна ў Мінску і прапанаваў узгадніць канкрэтную дату.

Расія ў выпадку неабходнасці гатова аказаць Беларусі дзяржпадтрымку ў пытаннях паставак газу, заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін.

«Мы дамовіліся аб тым, што, калі спатрэбіцца, расійскі бок гатовы аказаць Беларусі дзяржаўную падтрымку ў пытаннях паставак газу, каб гэтыя пастаўкі не былі абцяжарваючымі для Беларусі», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Разам з тым ён яшчэ раз пацвердзіў пазіцыю расійскага боку, што ў гэтым годзе пастаўкі газу ў Беларусь будуць ажыццяўляцца ў адпаведнасці з дзеючым кантрактам. «У той жа час мы гатовы ўжо цяпер пачаць перагаворы аб умовах паставак расійскага газу ў Беларусь з 2012 года», — сказаў прэм'ер-міністр Расіі.

Прэм'ер-міністр Беларусі адзначыў, што ў час перагавораў была практычна вызначана формула разліку за газ у 2012 годзе. «Ёсць адпаведная формула, ёсць графік руху да роўнадаходных цэн», — сказаў ён.

Міхаіл Мясніковіч таксама выказаў надзею, што пазіцыя расійскага боку дасць магчымасць забяспечыць канкурэнтаздольнасць беларускай эканомікі.

**БЕЛТА.**

Жывая зямля

## ЗАДУБСКІЯ ПТУШКАЛЮБЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**БРАТЫ Міхаіл і Кірыл Сідарэвічы з вёскі Задуб'е Ганцавіцкага раёна — памочнікі на незвычайнай птушынай ферме. Акрамя паштовых галубоў і беласнежных лебедзяў, на вясковым падворку сабрана ўнікальная калекцыя экзатычных птушак.**

...У руках іх бацькі, Сяргея Харытонавіча, пабывалі ўсе птушкі, якія гняздуюцца ў Беларусі. І глушцы з цецерукамі, дзятлы і шчыглы, снегіры і сычы, каршуны — нават чорны бусел і белая чапля. Прасцей пералічыць крылатых насельнікаў, якія яму яшчэ не сустрэліся. Ён — непераўзыдзены майстар-птушкалоў. Злавіць птушку для яго, прасцей не бывае.

— З маленства «лаваў» — на мясцовы манер кажа Сяргей. Дзякуючы Сідарэвічу некаторыя беларускія заапаркі могуць пахваліцца багатай птушынай калекцыяй. Гэтае дзіцячае захапленне крочыць з ім па жыцці і далей, чым бы Сідарэвіч ні займаўся і дзе б ён ні працаваў. Але з цягам часу забавы маленства перараслі ў сапраўднае птушынае хобі, і ў вёсцы Задуб'е з'явіўся экзатычны заапарк. Цяпер Сяргей — сацыяльны работнік, даглядае адзінокіх аднавяскоўцаў. Свая сям'я ў яго вялікая — чацвёра дзяцей. Любімая газета ў сям'і — «Звязда». Адным словам, падстаў сустрэцца з задуб'еўскім птушкалюбам аказалася больш чым дастаткова.

Беларускіх птушак Сідарэвічу было мала, і ён завёў страусаў, паўлінаў і фазанаў, «пасяліў» на падворку в'етнамскіх свіней і кітайскіх качак. Летам суседзі прынеслі маленькую казульку, каб выхадзіў. Падсадзіў да казы Белкі, у якой былі свае казляняты, і цяпер жывёлы неразлучныя. У агародзе на сажалцы гняздуюцца лебедзі і нават не адлятаюць зімою. Але страусы пражылі нядоўга — толькі тры гады. Сяргей адмовіўся трымаць гэтых птушак.



СТАР. 8

## Базавае пагадненне з Расіяй па будаўніцтве беларускай АЭС будзе падпісана ў І квартале 2011 года

**Аб гэтым паведаміў журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч па выніках праведзеных у Маскве перагавораў са старшынёй урада Расіі Уладзімірам Пуціным, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, у ходзе перагавораў знойдзены падыходы да вырашэння пытанняў, звязаных з парадкам фарміравання кошту будаўніцтва і тэрмінаў увядзення АЭС. Акрамя таго, абмяркоўвалася магчымасць актыўнага ўдзелу беларускіх арганізацый у рэалізацыі гэтага праекта. «З расійскім бокам у гэтым пытанні знойдзена поўнае ўзаемаразуменне», — сказаў прэм'ер-міністр.

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін адзначыў важнасць будаўніцтва АЭС для эканомікі Беларусі і пацвердзіў гатоўнасць расійскага боку да рэалізацыі гэтага праекта і яго крэдытавання. Паводле яго слоў, асноўным пытаннем, вакол якога яшчэ вядуцца дыскусіі, застаецца кошт будучай атамнай электрастанцыі.

Уладзімір Пуцін таксама пацвердзіў, што каля 40 працэнтаў у рэалізацыі праекта па будаўніцтве АЭС можа быць выканана беларускім бокам самастойна.

Міхаіл Мясніковіч таксама абмеркаваў з кіраўніцтвам Федэральнага касмічнага агенцтва Расіі падрыхтоўку да запуску беларускага касмічнага апарата. «Наш праект уступае ў завяршальную стадыю, — сказаў Міхаіл Мясніковіч на нарадзе ў Раскосмасе. — Хацелася б заслухаць даклады аб заключных работах, каб можна было прыняць адпаведныя рашэнні».

У сваю чаргу кіраўнік Раскосмасу Анатоль Пярмінаў выказаў надзею, што пасля запуску беларускага спадарожніка супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў касмічнай сферы не толькі захаваецца, але і прымножыцца.

## ПАСТАЎКІ РАСІЙСКАЙ НАФТЫ Ў БЕЛАРУСЬ АДНОВЯЦЦА НА БУДУЧЫМ ТЫДНІ

**Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў беларускай дэлегацыі, што прымала ўдзел учора ў Маскве ў перагаворах прэм'ер-міністраў Беларусі і Расіі Міхаіла Мясніковіча і Уладзіміра Пуціна.**

Пастаўкі нафты сталі адной з тэм перагавораў. Як паведаміў па іх выніках журналістам беларускі прэм'ер-міністр, кіраўнікі ўрадаў далі шэраг даручэнняў віцэ-прэм'ерам і міністрам, каб у бліжэйшыя дні вырашыць усе пытанні, звязаныя з паліўна-энергетычным комплексам.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін нагадаў, што ўрад Расіі ўзяў на сябе абавязацельства адмяніць пошліны за пастаўляемую ў Беларусь нафту пасля ратыфікацыі беларускім бокам базавых дакументаў па фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы. Бакі выканалі свае абавязацельствы, сказаў Уладзімір Пуцін, аднак засталося пытанне, звязанае з цэнаўтварэннем паставак.

У той жа час Уладзімір Пуцін запэўніў, што расійскі бок будзе імкнуцца да таго, каб прадастаўляемыя для беларускай эканомікі льготы ў нафтавым сектары былі не меншыя за тыя, якія існавалі да ўвядзення ў 2007 годзе нафтавых пошлін.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ТЭРАРЫСТЫ «ЎЗЯЛІ Ў ЗАКЛАДНІКІ» ГОРАД НА УКРАІНЕ: ЗДЗЕЙСНІЎШЫ ДВА ВЫБУХІ, ЯНЫ ПАТРАБУЮЦЬ 4 МЛН ЕЎРА




**У горадзе Макееўка Данецкай вобласці Украіны ў чацвер раніцай раздаліся два выбухі, услед за якімі мясцовае насельніцтва ўпала ў паніку: невядомыя тэрарысты пагражалі новымі ўдарамі, калі ім не выплацяць буйную суму грошай. Каб спрацаваць на апярэджанне і выявіць злачынцаў, у Макееўку накіраваны дадатковыя сілы міліцыі і выбуховатэхнічныя службы, паведамляе NEWSru ua.**

Адзін выбух адбыўся ў тэлефоннай будцы ў 04:37 побач з гандлёвым цэнтрам. Ахвяр і пацярпелых у выніку выбухаў няма. «Недалёка ад месца выбухаў знойдзены канверт з патрабаваннем да вядомых у Макееўцы людзей перадаць значную суму грошай па вызначаным адрасе. У адваротным выпадку невядомыя пагражаюць пяццю выбухамі», — сказаў намеснік міністра ўнутраных спраў Украіны Васіль Фарыннік. Паводле яго слоў, у выпадку адмовы тэрарысты пагражалі пяццю выбухамі ў чацвер у 17:00.



Па неафіцыйнай інфармацыі, у запісцы невядомыя патрабуюць 4 млн еўра і паведамляюць, што выбуховыя прылады закладзены ў іншых будынках горада. Арганізатары ідэнтыфікавалі сябе як «групу людзей, якая выступае супраць улады». «Нашы блізкія памерлі, нам няма чаго губляць», — таксама гаворыцца ў запісцы.

Ніякай інфармацыі пра магчымых арганізатараў выбуху пакуль няма. На момант падпісання нумара ў друк ні пра новыя выбухі, ні пра затрыманне тэрарыстаў не паведамлялася.

### ПАМЕР ДЗЯРЖДОЎГУ ЯПОНІІ ДАСЯГНУЎ КРЫТЫЧНАЙ АДЗНАКІ

**Японія дасягнула такой крытычнай адзнакі, за якой яна рызыкуе пазбавіцца інвестыцыйнага даверу, калі не зможа прыняць праграму скарачэння гіганцкага дзяржадоўгу, заявіў новы міністр эканомікі і бюджэтнай палітыкі Каору Іасана, паведамляе Financial Times.**

Зараз урад Японіі рыхтуе ўсёабдымную рэформу дзяржаўнай бюджэтнай палітыкі, якая, у прыватнасці, прадугледжвае ўвядзенне 5-працэнтнага падатку на спажыванне.

### У ЛАТВІІ ЎЗМАЦНІЛІ ЖОРСТКАСЦЬ ПАКАРАННЯ ЗА РОЗЫГРЫШ ВЫРАТАВАЛЬНІКАЎ

**Парламент Латвіі ўзмацніў жорсткасць пакарання за фальшывы выклік экстранных службаў, паведамляе DELFI. Такое рашэнне было прынята па ініцыятыве МУС пасля розыгрышу, які арганізавала кампанія Tele2 (аператар мабільнай сувязі), якая правяла імітацыю падзення метэарыта на тэрыторыі краіны.**



Па рашэнні Сойма, штрафы за падман паліцыі, хуткай дапамогі, пажарных і выратавальнікаў істотна павялічаны. Для юрыдычных асоб штраф складзе ад 500 да 5000 латаў (ад 960 да 9600 долараў). Для фізічных асоб — ад 25 да 150 латаў (ад 48 да 290 долараў). У выпадку з «метэарытам» рэкламнае агенцтва, якое выконвала замову Tele2, як адзначае агенцтва, абышлося штрафам у 25 латаў.

### ВЕНЕСУЭЛА СТАЛА СУСВЕТНЫМ ЛІДАРАМ ПА ВЫВЕДАНЫХ ЗАПАСАХ НАФТЫ

**У Венесуэле выведаныя запасы нафты па стане на студзень 2011 года складаюць 297 млрд барэляў. Пра гэта заявіў міністр энергетыкі і нафты краіны Рафаэль Рамірэс, паведамляюць інфармагенцтвы.**

На канец 2010 года краіна мела 217 млрд барэляў нафты і зараз, на пачатку 2011 года, гатовая сертыфікаваць 297 млрд. Сертыфікаваныя запасы краіны выраслі за кошт цяжкай нафты ў рэгіёне Арынока.

У выніку Венесуэла стала сусветным лідарам па запасах нафты, абагнаўшы па гэтым паказчыку Саудаўскую Аравію. Паводле звестак АПЕК, запасы Саудаўскай Аравіі ў 2009 годзе складалі 265 млрд барэляў.

## АРЫШТАВАНЫ ГАЛОЎНЫ ІНЖЫНЕР СЛУЖБЫ ЭЛЕКТРАЗАБЕСПЯЧЭННЯ КУП «МІНСКІ МЕТРАПАЛІТЭН»

### Падазраецца адказная асоба ў крадзяжы буйной сумы бюджэтных сродкаў

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУБЭЗ МУС Вераніка Пасмеццева, галоўнаму інжынеру ўжо прад'яўлена абвінавачанне. Падазраецца ж ён у тым, што выкраў бюджэтныя сродкі ў суме 94 мільёны рублёў. «Хібы» былі выяўлены падчас праверкі ўпраўленнем па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў ГУУС Мінгарвыканкама і Маскоўскага РУУС законнасці расходавання грошай, якія выдзяляліся на рэканструкцыю станцыі прымыкання метро «Усход». У прыватнасці, устаноўлена, што галоўны інжынер службы электразабеспячэння КУП «Мінскі метрапалітэн» арганізаваў вытворчасць электрамантажных работ на аб'екце ўласнымі сіламі. Пры гэтым быў заключаны фіктыўны дагавор субпадраду з ілжэпрадпрымальніцкай структурай, якая згаданыя работы не праводзіла, а ў адпаведнасці з актамі прыёмкі выкананых работ і плацяжамі ў перыяд з мая па снежань 2007 года атрымала на разліковы рахунак больш як 94 мільёны рублёў. Як патлумачыла дырэктар вышэйзгаданай структуры, сродкі, што яны атрымалі, пасля былі абнаяўлены і перададзены асобам, якія арганізавалі здзелку.

Кропка ў гэтай справе яшчэ не пастаўлена: устанаўліваюцца іншыя асобы, якія могуць мець дачыненне да ўчыненага злачынства.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Кватэрнае пытанне

## ПРАБЛЕМ НЕ БЫЛО І БЫЦЬ НЕ ПАВІННА

***Мы, бацькі, жывём разам з сям'ёй сына. Каб раз'ехацца, вырашылі купіць домік у вёсцы. Ужо нават нагледзелі і ў лістападзе схадзілі ў сельскі Савет. Там сказалі, што праблем не будзе, бо да канца 2010 года дзейнічае нейкі спрошчаны парадак афармлення. Ці змяніўся ён у 2011 годзе? І ў які бок?***

**Г.Ц.,** *г. Гомель.*

Сапраўды, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2005 г. № 368 «Аб некаторых пытаннях адчужэння жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах» быў вызначаны да 31 снежня 2010 г. асаблівы парадак заключэння і рэгістрацыі дагавораў куплі-продажу, мены, дарэння жылых дамоў з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі (або без іх), якія знаходзяцца ў сельскіх населеных пунктах і не зарэгістраваныя ў тэрытарыяльных арганізацыях па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, праў на яе і здзелак з ёй (звесткі пра якія былі ўнесены ў пагаспадарчую кнігу сельскага выканаўчага камітэта да 19 сакавіка 1985 года і якія з гэтай даты не з'яўляліся прадметамі куплі-продажу або мены).

Згодна з гэтым парадкам не патрабавалася дзяржаўная рэгістрацыя названых дагавораў у арганізацыях па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці. Дагаворы заключаліся ў пісьмовай форме і падлягалі рэгістрацыі (бясплатна) у сельскіх выканаўчых камітэтах.

Улічваючы, што гэты парадак забяспечыў стварэнне спрыяльных умоў для эфектыўнага выкарыстання названай катэгорыі жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 лістапада 2010 г. № 616 унесены змяненні ва Указ № 368, якімі вызначаны бестэрміновы характар яго дзеяння.

**Віктар САВІЦКІ.**

«Прамыя лініі»

## ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ПАДАЕ ЗРОК?

Нагрузка на вочы ў наш час велізарная. Адсюль і парушэнне зроку. Якія хваробы пагражаюць вачам, як засцерагчыся ад іх і што рабіць, калі вы пачалі бачыць горш? На гэтыя і іншыя пытанні падчас нашай «прамой лініі» адкажа **кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Галіна Раманаўна СЯМАК.** «Прамая лінія» з яе ўдзелам адбудзецца **сёння** з **12.00** да **13.30** па тэлефонах **8(017) 292 38 92** і **292 38 21**.

## УСЁ ПРА ТРАДЫЦЫІ І АБРАДЫ!

На наступным тыдні, у чацвер, **27 студзеня**, з **15.00** да **16.00**, «прамую лінію» з чытачамі «Звязды» правядуць **вядучыя пастаяннай рубрыкі «Свет і сусвет чалавека», аўтары кнігі «Залатыя правілы народнай культуры», кандыдат філалагічных навук, дактарант Белдзяржуніверсітэта Іван Іванавіч (Янка) КРУК і этнакультуролаг Аксана Веньямінаўна КАТОВІЧ.** Тэлефануйце ў пазначаны час — і атрымаеце адказы на любыя пытанні, якія датычацца падрыхтоўкі і правядзення найважнейшых жыццёвых абрадаў і рытуалаў: хрышчэння, вянчання, вяселля, увaходзін, пахавання і інш. «Прамая лінія» адбудзецца па нумарах: **(8 017) 292 38 92, 292 38 21**. Папярэднія пытанні можна задаць па нумарах: **(8 017) 287 18 29, 292 21 03**.

## МІНТРАНС ПРОСІЦЬ УРАД ПАВЫСІЦЬ ТАРЫФЫ НА ПРАЕЗД У ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ

**Міністэрства транспарту і камунікацый звярнулася ва ўрад з прапановай аб павышэнні тарыфаў на праезд у грамадскім транспарце. Аб гэтым паведаміў учора на прэс-канферэнцыі намеснік міністра транспарту і камунікацый Беларусі Аляксандр Шышко, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

Паводле яго слоў, для таго каб транспартныя прадпрыемствы працавалі стабільна, дзейных тарыфаў — па Мінску Br700, у іншых гарадах Br600 — недастаткова. «Растуць цэны на паліва і запчасткі, нашы прадпрыемствы атрымліваюць субсідыі з бюджэту, але яны невялікія, таму прадпрыемствы працуюць стратна», — адзначыў Аляксандр Шышко.

Намеснік міністра падкрэсліў, што транспартнікі разумеюць, што размова ідзе аб сацыяльна значных перавозках. «Але ж трэба думаць і аб рухомым саставе, падтрымліваць яго ў нармальным стане, а таксама аб зарплаце вадзіцеляў. Сёння, на жаль, некаторыя з іх звальняюцца ў сувязі з тым, што зарплату не павышаюць», — дадаў намеснік міністра. Пры гэтым ён падкрэсліў, што Мінтранс просіць павышаць тарыфы не скачкападобна, а паступова. «Калі б сёння ўстанавілі тарыф у Br1000-1200, гэта падцягнула б нашы прадпрыемствы», — сказаў намеснік міністра. Ён звярнуў увагу на пастаянны рост цэн на паліва. «Калі, напрыклад, у 80-я гады ў сабекошце перавозак паліва складала 7-11 працэнтаў, сёння ў сярэднім гэты паказчык вагаецца ад 30 да 35 працэнтаў, утварыўшы істотны дысбаланс», — канстатаваў Аляксандр Шышко.

БЕЛАРУСБАНК

Беларусбанк продолжает акцию по досрочному погашению кредитов на общих основаниях. Хотите заплатить меньше, погасите кредит досрочно. Подробности проведения акции — у консультантов и на веб-сайте Беларусбанка.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

БЕЛАРУСБАНК

Беларусбанк снижает с 1 февраля 2011 года процентные ставки по ранее заключенным с физическими лицами кредитным договорам на потребительские нужды в белорусских рублях. Более подробную информацию можно получить в любом учреждении банка.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

БЕЛИНВЕСТБАНК

**Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» сообщает 3 февраля 2011 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 29 в 11.00 часов проводится внеочередное общее собрание акционеров банка в заочной форме.**

В повестку дня внеочередного общего собрания акционеров банка (далее – Собрание) внесены следующие вопросы:

1. О процедурных вопросах.
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата формирования реестра владельцев акций, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 21 января 2011 года.

Бюллетени для заочного голосования, иную информацию о проведении Собрания лица, имеющие право на участие в нем, могут получить под роспись при обращении в банк по адресу: 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29, а также в его филиалы по месту учета акций.

Окончательная дата представления заполненных бюллетеней для заочного голосования – 31 января 2011 года.

**Телефоны для справок: (8 017) 239 01 42, 239 02 87**

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», УНП 807000028. Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006

ОАО «Управление механизации № 91»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ, ЧТО ОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ СОСТОИТСЯ 25 февраля 2011 года в 10 часов по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11.**

Регистрация участников начинается с 08 часов 45 минут по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах работы финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества на 2011 год.
2. Утверждение годового бухгалтерского отчета, баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2010 год. Утверждение дивидендов за 2010 год.
3. Утверждение порядка распределения прибыли, оставшейся в распоряжении предприятия за 2010 год. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2010 году.
4. О работе Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии в 2010 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

**Тел. 8(017) 226 77 63.**

**Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91»**

УНП 100055130

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.01.2011 г. (для б/н разлікаў)

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 016,00 | 1 чэшская крона | 167,36 |
| ▲ 1 еўра | 4 061,04 | 1 польскі злоты | 1 045,39 |
| 1 латвійскі лат | 5 782,76 | ▼ 1 расійскі рубель | 100,82 |
| 1 літоўскі літ | 1 177,37 | 1 украінская грыўня | 379,54 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,9147 |
| 10 UAH | 37,6404 |
| 1000 BYR | 9,9187 |
| EUR | 40,2113 |

ISSN 1990 - 763X

# ПАНЯДЗЕЛАК, 24 СТУДЗЕНЯ

## ПЕРШЫ

**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**6.05, 7.10, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45, 16.05** Nota Bene.
**7.05, 8.10, 18.50, 1.00** Зона Х.
**7.30, 8.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.30** «У свеце матораў».
**9.10** Ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Я з няпоўнай сям'і».
**10.10** Здароўе.
**10.35** Культурныя людзі.
**11.00, 17.25 Серыял «Маруся».**
**12.10 Меладрама «Радасці і беды маленькага лорда».**
**14.05** Шоу «Вялікая розніца».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**18.25** «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ход у адказ.
**21.00** «Панарама».
**21.45 Серыял «Падмані мяне».**
**22.55** «Эпоха». «Радзівілы. Нясвіжскія ўладанні». Частка 1-я.
**23.25 Баявік «Дублёр».**
**1.05** Дзень спорту.
**1.15** Хакей для ўсіх.

## АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.45** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.10 «Мая жонка мяне прываражыла». Серыял.**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50 «Тата на ўсе рукі». Серыял.**
**12.20 «Дэтэктывы».**
**13.10** «Кантрольная закупка».
**13.45** «Модны прыгавор».
**14.50** «Зразумець. Даравацъ».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.**
**17.05 «Слова жанчыне». Серыял.**
**18.20** «Адваротны адлік». Бізнэс па-савецку або жыццё ўдалося».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Як ёсць. Тэхналогіі пераваротаў».
**21.45 «Капітан Гардзееў». Серыял.**
**23.05** «Праўдзівая гісторыя. Тэгеран-43».
**0.05** «Віёла Тараканава. У свеце злачынных страсцяў».
**0.55** Начныя навіны.

## ЛАД

**6.35, 23.00 Серыял «Універ».**
**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00, 15.45, 21.20** Тэлебарометр.
**8.05, 16.55 Серыял «Чыста англійскія забойствы».**
**9.00, 18.00 Серыял «Ты маё жыццё».**
**10.00 Меладрама «Чужая радня».**
**11.45** Пра мастацтва.
**12.10** Школа рамонту.
**13.10** Дак. фільм «Апошняе прыстанішча пірацкай шхуны».
**14.05 Серыял «Сіла прыцяжэння».**
**15.05** М/с «Сямейка піратаў».
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**16.05, 0.55 Серыял «Налётчыкі».**
**19.05** Хакей. КХЛ. Віцязь (Чэхаў) — Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
**21.25** Беларуская часінка.
**22.25 Серыял «Інтэрны».**
**23.30** Авертайм.
**0.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.35** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40 Серыял «Багатая і каханая». Заключная серыя.**
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35** «Я — падарожнік».
**13.00** «Ля параднага пад'езда». Мірскі замак.
**13.50** «Зорны рынг». Тані Фарэда супраць групы «Механіка».
**15.00** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.00** «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**18.30 Серыял «Дарослыя гульні».**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.35 Маст. фільм «Фартовы».**
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25 Маст. фільм «Ундзіна».**

## МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці.
**5.05, 19.00 Серыял «Прынцэса цырка».**
**6.05** «Цік-так».
**6.20** «У гасцях у Вітамінкі».
**7.05** «Саюзнікі».
**7.35** «Агульны рынак».
**8.05, 22.05** «Жывая гісторыя».
**9.05** «Разам»
**10.05, 2.30 Серыял «Ваўчыха».**
**11.05, 3.30 Маст. фільм «Ганна на шыі».**
**13.05** М/с «Мільён гадоў да нашай эры».
**13.30 Серыял «Старшакласнікі».**
**14.05 Серыял «Люба, дзеці і завод».**
**14.30** «Ахвота да змены месцаў».
**15.20** «Дом з гісторыяй».
**16.05, 23.05 Серыял «Вылечванне каханнем».**
**17.05, 0.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**18.20** «Акцэнты».
**18.30, 2.00** «Агульны інтарэс».
**19.50, 1.05 Серыял «Вогнезмагары».**
**20.45** «XX стагоддзе: найвялікшыя моманты гісторыі».
**21.20** «Свет спорту».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 10.55, 16.30, 19.45, 21.05, 23.20** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**7.20, 16.35 Серыял «Прытворшчык».**
**8.10** «Асабістая справа».
**9.00** «К-відэа» для дзяцей».
**9.30, 16.00** «Мультпарад».
**10.00 Серыял «Яе звалі Нікіта».**
**11.00 Драма «Наводчыца».**
**12.40, 15.40** «Кінаблакнот».
**13.00 Фантастыка «Штучны інтэлект».**
**17.30** «Мой любімы гадаванец».
**18.00 Серыял «Яна напісала забойства».**
**19.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**21.10 Трылер «Праклёцце Мёртвага возера».**
**22.50** Знаёмствы «Life».

## ВТБ

**6.00, 23.30** «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00, 15.00, 19.00 Серыял «Ранеткі».**
**11.00, 14.00 Серыял «Цуды. com».**
**12.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**16.00 Баявік «Неаспрэчны-2».**
**21.00 Драма «Быць Стэнлі Кубрыкам».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.00** «Карціна свету».
**9.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 18.50 Серыял «Еўфрасіння».**
**12.20, 17.20 «Кулагін і партнёры».**
**12.50** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15 Серыял «Дворык».**
**17.50 Серыял «Чорная багіня».**
**20.30 Серыял «У лясах і на гарах».**
**22.20 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».**
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.45** «Весткі.ru».
**0.00** «Развітанне з песняром. Уладзімір Мулявін». Дак. фільм.

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.10, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**6.15** «НТБ раніцай».
**8.35 Серыял «Таксістка».**
**9.30, 15.30, 18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суда».
**13.30 Серыял «Ментоўскія войны».**
**15.10** «Справа густу».
**16.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.35 Серыял «Бывай, «Макараў!».**
**21.30 Серыял «Зверабой».**
**23.40 Серыял «Шпіёнскія гульні».**

## ТНТ

**5.00** «Невытлумачальна, але факт».
**6.00, 11.40** «Нікеладэон на ТНТ».
**7.30, 0.00** «Камедзі Клаб».
**8.30, 17.00, 19.00 «Універ». Сітком.**
**9.30, 18.00** «Жаночая ліга: хлопцы, грошы і каханне».
**10.00, 18.30 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**10.45** М/с «Мішн Хіл».
**12.30** М/с «Бэтмен: адважны і смелы».
**13.00** «Жаночая ліга».
**13.30, 22.00, 3.40** «Дом-2».
**14.55 «Ніколі не здавайся». Баявік.**
**17.30, 19.30 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**20.00 Камедыя «Вельмі страшнае кіно-4».**
**23.30** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**1.00 «Сябры». Серыял.**
**1.50 «Суперніца». Трылер.**
**4.45** «Камедыянты».

## ІНТЭР+

**7.00** — *Прафілактыка.*
**14.00, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**14.50** Украінская топ-дваццатка.
**16.10, 1.45 Серыял «Свая каманда».**
**16.40, 0.50 Серыял «Простыя ісціны».**
**17.40, 2.15 Серыял «Танга ўтраіх».**
**18.25, 3.30 Серыял «Агонь кахання».**
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
**21.20, 5.50 Серыял «Невідзімкі».**
**22.05 Маст. фільм «Сірано дэ Бержэрак».**
**23.35** Агенты ўплыву.
**0.00** Утоеная рэальнасць «Хто выратуе чалавецтва».
**5.05** «Брама часу».
**6.35** Феерыя падарожжаў.

## КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 18.30, 22.30** Навіны культуры.
**9.15** «Хто там...».
**9.40, 0.35** Праграма перадач.
**9.50 «Балада пра салдата». Маст. фільм.**
**11.20** «К. Р.» Дак. фільм.
**12.00, 20.25** «Цуды Сонечнай сістэмы». Дак. серыял.
**12.50** «Эскізы «Пасольскай лесвіцы».
**13.20** «Выпадак з доктарам Лекрыным». Спектакль Сяргея Юрскага.
**14.10, 16.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**14.30** Навіны культуры. Дзіцячы сеанс.
**14.40** «Зверапорт». М/с.
**14.50** «Бяжы, раўчук». «Кацігарошак». М/ф.
**15.20 «Тры талеры». Маст. фільм.**
**15.45** «Маёнтак сурыкатаў». Дак. серыял.
**16.10** Куміры. Сяргей Філіпаў.
**16.55** Моцарт. «Каранацыйная імша».
**17.40, 0.40** «Шукальнікі».
**18.45** Галоўная роля.
**19.05** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.45** «Астравы».
**21.15** «Тым часам».
**22.00** Дак. серыял «Святая адзінота».
**22.50 «Сімяон Пустэльнік». Маст. фільм.**
**23.40** «Ціхі акіян». Дак. фільм.
**0.10** Б. Брытэн. Варыяцыі на тэму Ф. Брыджа.
**1.30** Рэспігі. «Святы Рыма».

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Да і пасля...». Год 1991.
**6.10** «У суботу вечарам». 1991 год.
**7.30** «Як сыходзіў Гарбачоў». 1991 год.
**8.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00 «Чыча». Маст. фільм.**
**10.30** «Тэмп». 1992 год.
**11.00** «Акулы пяра».
**11.50, 21.00** «Народжаны ў СССР».
**12.55** «Вясёлая моладзь». 1983 год.
**14.00** «Быў час».
**15.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1977 год.
**17.00** «Раніцай: «Міні-ЦТ». 1991 год.
**18.00** «Трагедыя дзевяці мільёнаў». «Згодны на любую працу». Дак. фільм.
**18.35 «Канікулы Кроша». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**22.05** «Праграма «А». 1989 год.
**23.00** «Сустрэчы з майстрамі сцэны». Яўген Мацвееў. 1972 год.
**0.00** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. 1977 год.
**3.00** «Колба часу» з Аляксандрам Лаэрцкім.
**4.05** «Кінапанарама». 1981 год.

## MTV

**5.00, 0.45** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**7.35** Руская дзясятка.
**8.30, 23.25** Шалёныя продкі.
**8.55, 23.50** Магія Крыса Энджэла.
**9.20** Праўда жыцця: У мяне скончыліся бабкі...
**10.10** Дочкі-маці.
**11.00** Немагчымае магчыма.
**11.50** Хто круцейшы.
**12.15, 18.50** News блок.
**12.25, 17.30** «Подыум».
**13.45, 21.20 «Два з паловай чалавекі». Серыял.**
**14.10, 20.55 «Усё лепшае ў табе». Серыял.**
**14.35, 19.00 «Ранеткі». Серыял.**
**15.35, 20.00 «На службе ў д'ябла». Серыял.**
**16.30** Біся і спявай.
**21.45 «Клініка». Серыял.**
**22.10 «Клава, давай!». Серыял.**
**22.35** Трэндзі.
**23.00** Тайныя спакусы курортнага гатэля.
**0.15** Тэлепорт.

## НАША КІНО

**6.30, 12.35** Камедыя «Яна вас кахае».
**7.55, 14.00** Драма «Ведзьма».
**8.30, 14.30** Дэтэктыў «Прывал вандроўнікаў».
**10.50, 16.50** Меладрама «Пра каханне».
**12.05** Плюс кіно.
**18.30, 0.30** Меладрама «Дочкі-маці».
**20.30, 2.30** Маст. фільм «Ленін у 1918 годзе».
**22.30, 4.30** Меладрама «Мордачка».

## ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Бухта Філіпа».
**3.45** Камедыя «Гараж».
**5.25** Фестывальнае кіно. «Чучала».
**7.25** Кінараман «Пяць дзён, пяць начэй».
**9.05** Новы хіт. Трагікамедыя «Вяселле».
**11.45** Новы хіт. Чорная камедыя «Даун Хаус».
**13.05** Трагікамедыя «Стары Новы год».
**15.20** Мюзікл па-руску «Скарбонка».
**17.35** Новы хіт. «Відрымасгор, або Гісторыя майго космасу».
**19.45** Новы хіт. Камедыя «Ландыш серабрысты».
**21.15** Золата «Масфільма». «Дзевяць дзён аднаго года».
**23.00** Музычная камедыя «Наш чалавек у Сан-Рэма».
**0.45** Псіхалагічная драма «З вечара да поўдня».

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Фільм-казка «Казка пра закаханага маляра».
**6.20, 10.20, 14.20** М/с «На задняй парце». Казкі Пушкіна. «Казка пра папа і пра работніка яго Балду».
**7.00, 11.00** М/ф «Ключ».
**8.00, 12.00** Рускія народныя казкі. «Васіліса Прыгожая». М/ф: «Дом, які пабудаваў Джэк», «Прамое пападанне», «Чароўнае лякарства», «Вясёлая карусель» № 9.
**15.00** Маст. фільм «Хвалі Чорнага мора». 1-я серыя.
**16.10** М/с «Светлячок». М/ф: «Агонь», «Вясёлая карусель» № 14.
**17.00** Казкі народаў свету. «Гунан-батар». М/ф: «Усмешка Леанарда да Вінчы», «Івашка і Баба-Яга», «Жывая цацка».
**18.00** Рускія народныя казкі. «Стары і журавель». М/ф: «Паморская быль», «Канікулы Баніфацыя».

## ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Легенда пра Тампука».
**20.00, 2.00** Серыял «Мент у законе».
**21.00, 3.00** Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**22.00, 23.30** Маст. фільм «Хмель». 1-я і 2-я серыі.

## ТБ3

**5.00** М/ф.
**5.30, 1.00** «Альф». Серыял.
**6.00, 1.30** «Трэцяя планета ад Сонца». Серыял.
**6.30, 15.30** «Як гэта зроблена».
**7.00, 14.30** Разбуральнікі міфаў.
**8.00** Дак. фільм «Сучасныя цуды».
**9.00** Маст. фільм «Чужыя грошы».
**11.00** «Далёка і яшчэ далей».
**12.00** Дак. фільм «Гарадскія легенды. Ажыўшыя карціны Траццякоўскай галерэі».
**12.30** Маст. фільм «Уварванне».
**16.00, 0.00** «Чорная метка». Серыял.
**17.00** Дак. фільм «Скачок коштам у паўтара мільёна».
**18.00** «Медыум». Серыял.
**19.00** «Секунда да...». Серыял. 1-я серыя.
**20.00** Дак. фільм «Апакаліпсіс. Эканамічны крызіс».
**21.00** Маст. фільм «Чалавек з будучыні».
**23.00** «Вавілон-5». Серыял.
**2.00** Дак. фільм «Сучасныя цуды».
**3.00** «Анёл». Серыял.
**На рэках Гомельскай вобласці пачаўся паступовы, месцамі інтэнсіўны, рост узроўняў вады, паведамляюць у Гомельскім абласным цэнтры па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя.** Прычынай стала плюсавая тэмпература паветра, што прывяло да раставання снежнага покрыва на водных аб'ектах. Небяспечныя гідралагічныя ўмовы адзначаюцца ў паўднёвых рэгіёнах, у прыватнасці, на рэках Прыпяць, Убарць і Гарынь. Сутачны рост узроўняў вады складае ад +1 да 6 см. Вада стаіць над лёдам, ад выхаду на пойму яе аддзяляюць 30-35 см. Таўшчыня лёду зараз складае ад 14 да 26 см. Найбольш небяспечная сітуацыя назіраецца на рацэ Пціч, дзе ўзровень вады над нулявой адзнакай складае 350 см. Калі і далей рост вады за суткі будзе складаць 6 см, да небяспечнага ўзроўню — 370 см — рака падымецца праз трое сутак. У Гомельскім абласным МНС лічаць, што перадумоў да ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі пакуль няма. Тым не менш выратавальнікі пачалі праводзіць штодзённы маніторынг стану рэк.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Юбілей

# НАКАНАВАННЕ ТЭАТРА: АД 20 ГАДОЎ І БОЛЬШ

## Яны паказваюць, што ёсць беларуская драматургія

**Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі стварыўся тады, калі грамадства было заклапочана, каб з'яўляліся свае п'есы і каб можна было знайсці і падтрымаць іх аўтараў, якія б мелі магчымасць убачыць свой твор на сцэне. Сучасная беларуская драматургія — вось галоўная задача, на якую павінен працаваць гэты тэатр.**

Аднак яго мастацкі кіраўнік Валерый Анісенка працуе і з сусветнай драматургіяй — драмы «Рычард» і «Макбет» беларускі глядач прыняў, нібыта гэта частка яго культуры, — нават сусветныя шэдэўры тэатр рабіў зразумелымі для нас. Тое ж было і са спектаклем «Сонечка» — гэта інсцэніроўка вядомай беларускай аўтаркі Алены Паповай паводле Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне». Менавіта гэты, яшчэ «свежы», спектакль тэатр абраў для святкавання свайго 20-годдзя, якое пройдзе 21 студзеня.

Сур'ёзнае свята — 20 гадоў. Аднак людзі тэатра думаюць пра тое, каб глядач сапраўды адчуў святочны настрой, — і рыхтуюць капуснік. Адным з ганаровых і чаканых гасцей у гэты вечар будзе міністр культуры Беларусі Павел Латушка. Госці збіраюцца прыехаць нават з замежжа, каб павіншаваць малады беларускі тэатр.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Інжынерныя войскі святкуюць сваё 310-годдзе

**310-годдзе сёння адзначаюць інжынерныя войскі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь: 21 студзеня 1701 года ўказам Пятра І была заснавана першая інжынерная школа, а ў 1999 годзе Указам Прэзідэнта Беларусі гэты дзень быў афіцыйна зацверджаны як Дзень інжынерных войскаў у нашай краіне. Пра тое, у якім стане знаходзяцца сёння інжынерныя войскі Беларусі, журналістам расказаў палкоўнік Алег ВОІНАЎ, начальнік інжынерных войскаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь:**



— Інжынерныя войскі паказалі сваю неабходнасць і сваю жыццяздольнасць — і гэта пацвярджае тое, што ніводная буйная бітва, лакальны канфлікт не абыходзяцца без прымянення інжынерных войскаў, — сказаў Алег Воінаў. — Інжынерныя войскі таксама адрозніваюцца ад іншых радоў тым, што яны запатрабаваны і ў мірныя часы і выконваюць баявыя задачы па размініраванні тэрыторыі Беларусі ад выбуханебяспечных прадметаў. У пастаяннай гатоўнасці ў нас знаходзіцца 31 група размініравання ад 14 злучэнняў воінскіх часцей, і па выніках мінулага года імі было абясшкоджана 23,5 тысячы выбуханебяспечных прадметаў. Алег Воінаў таксама падкрэсліў, што інжынерныя войскі гатовыя прыйсці ў любы час года на дапамогу цывільнаму насельніцтву і народнай гаспадарцы: расчысціць дарогі ўзімку, пабудаваць масты і пераправы вясной пры ўскрыцці рэк, тушыць лясныя пажары ўлетку.

— Нам вельмі прыемна, што мы не стаім на месцы: па-першае, пераводзім сродкі інжынернага ўзбраення і тэхнікі на айчынную базу; па-другое, праводзім мадэрнізацыю існуючых сродкаў інжынернага ўзбраення; і нарэшце, аптымізуем нашу тэхніку: калі раней нейкую задачу выконвалі 2-4 машыны, то зараз, з прыняццем на ўзбраенне ўніверсальных машын, гэтую задачу выконвае адна машына і адзін экіпаж. Гэта дазваляе паменшыць тэрміны выканання задач і працазатраты, — сказаў Алег Воінаў.

Цікава, што шмат увагі ў рамках развіцця інжынерных войскаў надаецца маскіроўцы і імітацыі. Ужо сёння прыняты на ўзбраенне маскіровачныя камплекты зімовага і летняга варыянту, а на падыходзе — пясочны. Як адзначыў Алег Воінаў, гэтыя маскіровачныя камплекты вырабляюцца на беларускіх прадпрыемствах.

— Яшчэ адзін з напрамкаў, які мы распрацоўваем, — гэта стварэнне пнеўматычных макетаў баявой тэхнікі высокай дэталізацыі. Сёлета мы плануем правесці доследную эксплуатацыю падчас апаратыўных вучэнняў і праверыць іх тэхнічныя характарыстыкі, — паведаміў Алег Воінаў.

Па яго словах, цяпер шэраг макетаў тэхнікі ВПС і войскаў ППА ўжо ёсць у інжынерных войсках, аднак новыя ўзоры будуць, па-першае, з высокай ступенню дэталізацыі, а па-другое, разварочвацца з дапамогай пнеўматыкі.

У цэлым, як адзначыў палкоўнік Алег Воінаў, інжынерныя войскі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь добра падрыхтаваныя, якасна выконваюць задачы інжынернага забеспячэння і адпавядаюць усім патрабаванням.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## І ЗАДАРМА НЕПАТРЭБНАЯ...

**Каля дома па вул. Ракасоўскага ў Баранавічах стаяла аўтамашына «ВАЗ-2101», якую нехта ўкраў.**

Крадзяжы аўтамабіляў здараюцца часта, але каб красці «капейку», якой 35 гадоў...

Злодзеем аказаўся 20-гадовы беспрацоўны, якога шукаюць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Открытое акционерное общество
«БЕЛОРУССКАЯ ВАЛЮТНО-ФОНДОВАЯ БИРЖА»

**сообщает о проведении внеочередного Общего собрания акционеров, которое состоится 10 февраля 2011 г. в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 48 «а».**

Регистрация участников с 15.00 до 15.25.

**В повестку дня собрания включен вопрос** «О внесении изменений в состав Наблюдательного совета ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, сформирован на основании реестра акционеров по состоянию на 19.01.2011.

Для регистрации участнику при себе необходимо иметь документы, удостоверяющие личность и подтверждающие полномочия на участие в собрании.

**Телефон для справок: 306 34 64.**

## ЗАЛАТЫ ВЯСЕЛЬНЫ СЕЗОН

**Па завяршэнні каляднага посту распачаўся новы сезон шлюбаў. У Магілёве за апошнія два тыдні зарэгістраваны 60 маладых пар. У Палацы шлюбаў абласнога цэнтра цяпер актыўна святкуюць і юбілейныя вяселлі: сёлета залаты шлюб адзначыла ўжо 5 пар.**

Разам пражылі 50 гадоў Надзея Піліпаўна і Аркадзь Дзмітрыевіч Карэвіны. Але прыйшлі ў ЗАГС першы раз у жыцці, таму што ў 1961 годзе маладых распісалі прама дома, сціпла адзначылі падзею самагонкай. Затое цяперашнюю цырымонію залатога вяселля дзеці і ўнукі Карэвіных разам з супрацоўнікамі ЗАГСа арганізавалі належным чынам, каб усё было прыгожа і ўрачыста.

— Сям'ёй трэба даражыць: паважаць і кахаць адзін аднаго, а таксама і саступаць, і тады ўсё будзе добра, — раяць залатыя юбіляры.

**Ілона ІВАНОВА.**

Ёсць нагода!

# Сёння — Міжнародны дзень абдымкаў

**21 студзеня ва ўсім свеце адзначаецца адно з самых незвычайных свят — Дзень абдымкаў. Згодна з традыцыяй, заключаць у абдымкі ў гэты дзень можна нават зусім незнаёмых людзей.**

Адзначаць такі вясёлы дзень людзі сталі не так даўно, але дакладнае аўтарства ініцыятывы свята невядома. Тым не менш, можна смела заявіць, што вытокі Дня абдымкаў трэба шукаць у студэнцкім асяроддзі заходнееўрапейскай моладзі. Менавіта ў гэты дзень хлопцы і дзяўчаты заключалі адзін аднаго ў абдымкі без усялякай інтымнай падаплёкі.

Абдымкі суправаджаюць нас на працягу ўсяго жыцця. Мы абдымаем сяброў і родных пры сустрэчы, пры развітанні, калі хочам выказаць сваю радасць, удзячнасць, падтрымку. Ёсць легенда, што падчас сяброўскіх абдымкаў людзі абменьваюцца душэўным цяплом. Псіхолагі лічаць, што людзі, якія імкнуцца заключыць вас у абдымкі, хочуць адчуць бяспеку, камфорт і любоў.

Здарова, што святкаванне Дня абдымкаў не запатрабуе ніякіх матэрыяльных затрат. Варта проста шчодра падзяліцца сваім душэўным цяплом з усімі, каго палічыце вартымі гэтага.

### Дзень бабулі ў Польшчы

Сёння нашы заходнія суседзі віншуюць сваіх бабуль з іх «прафесійным» святам — Днём бабулі. Бабулям дораць кветкі і падарункі, абавязкова заходзяць у госці. А бабулі частуюць сваіх унукаў салодкімі пірагамі.

Вынікі апытання, праведзенага ў гэты дзень, паказалі, што 60 працэнтаў палякаў упэўнены ў тым, што іх маральныя прынцыпы, рэлігійныя перакананні і пачуцці — вынік цеснага кантактавання са сваёй бабуляй. Таксама ў працэсе даследавання, праведзенага прафесарам Хэральдам Эйлерам сярод 2 тысяч рэспандэнтаў ва ўзросце ад 16 да 80 гадоў, высветлілася, што большасць апытаных лічыць сваю сувязь з роднай бабуляй вельмі моцнай і стабільнай.

Нягледзячы на тое, што многія бабулі бачаць сваіх унукаў як мінімум раз на тыдзень, а трэць з іх прысвячае ўнукам больш за палову свайго вольнага часу, бабулі ўсё роўна з нецярпеннем чакаюць надыходу «бабулінага дня», калі ўсе іх дзеці і ўнукі збіраюцца разам.

Дзеля справядлівасці адзначым, што за Днём бабулі адзначаецца і **Дзень дзядулі (22 студзеня)**.

### ТОРАБЛОЎТ у Ісландыі

Адзначаючы гэтае свята, ісландцы аддаюць даніну памяці свайму мінуламу.

Тораблоўт (Torrablout) святкуецца з канца студзеня і да канца лютага. Яго назва паходзіць ад назвы чацвёртага месяца зімы па ісландскім календары — Торы (да гэтага часу ў Ісландыі прынята вылучаць толькі дзве пары года — лета і зіму). Упершыню свята згадваецца ў рукапісах XIII стагоддзя, таму Тораблоўт лічыцца старажытным святам, хоць афіцыйна адзначацца пачаў толькі з 1960 года.

Сёння Тораблоўт сімвалізуе вяртанне да нацыянальных каранёў, таму на працягу ўсяго месяца прынята ўжываць нацыянальныя стравы, якія некалі з'яўляліся асновай харчавання жыхароў краіны. У меню ўваходзяць такія далікатэсы, як вэнджаная нага барана, вэнджаная сёмга, а таксама незвычайныя для замежных турыстаў вэнджаная галава авечкі, мяса кіта, заквашаныя яечкі барана. Запіваць усё гэта варта ісландскай бульбяной гарэлкай «брэнівін», якую ў народзе яшчэ называюць «чорная смерць».

Святкаванне Тораблоўта суправаджаецца і адмысловымі рытуаламі, сярод якіх ёсць даволі забаўны звычай: сустракаючы Торы, гаспадар дома скакаў вакол дома на адной назе басанож, пры гэтым ён павінен быў быць толькі ў адной штаніне, каб другая свабодна целяпалася.

Сёння мала знойдзецца ісландцаў, якія працягваюць выконваць гэтую традыцыю, аднак 21 студзеня (пачатак Тораблоўта) у Ісландыі па-ранейшаму з'яўляецца і **Днём сужэнца**. У гэты дзень жанчыны імкнуцца не толькі выконваць жаданні сваёй паловы, але і папярэджваць іх.

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



### КАЛІ КІРОЎЦА НЕ РЭАГУЕ

У в. Дзівін Кобрынскага раёна супрацоўнікі міліцыі вечарам прымянілі зброю, каб спыніць аўтамашыну, калі кіроўца спрабаваў уцячы. Мясцовы жыхар, работнік ЖКГ, кіраваў аўтамашынай у п'яным стане.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### СУВЕНІР ЗА 290 ТЫСЯЧ

Сувенірны білет-імітацыю пад пяцітысячную расійскую купюру падсунуў для абмену ў прыватным парадку адзін грамадзянін другому на тэрыторыі АЗС у Светлагорскім раёне. Той адлічыў яму 290 тысяч сапраўдных беларускіх рублёў і не заўважыў надпісу: «Банк прыколаў».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»**

**31 января 2011 г.** по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32 состоится внеочередное общее собрание акционеров. Начало работы собрания в 13.30. Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 13.00 до 13.30.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О даче согласия на увеличение доли Республики Беларусь в уставном фонде Общества.

2. О реорганизации ЧСУП «Ляховичское-Агро» путем присоединения ЧСУП «Лясковичское». УНП 200075434

# БЕЛАРУСЬ НА «ЕЎРАБАЧАННІ» Ў ДЗЮСЕЛЬДОРФЕ ВЫСТУПІЦЬ 12 МАЯ

**ДНЯМІ ў Дзюсельдорфе прайшла жараб'ёўка краін-удзельніц 56-га песеннага шоу «Еўрабачанне-2011». У выніку Беларусь трапіла ў другі паўфінал і сваім выступленнем яна будзе адкрываць другую частку праграмы.**

Разам з Беларуссю ў другім паўфінале выступяць таксама нашы суседзі Украіна, Эстонія і Латвія. А вось Расія, Польшча і Літва пазмагаюцца за выхад у фінал 10 мая падчас першага паўфіналу.

Згодна з правіламі, беларусы змогуць прагаласаваць за песні толькі таго паўфіналу, у якім выступаюць самі (за Расію ў паўфінале Беларусь галасаваць не зможа). А вось з тых краін, якія традыцыйна трапляюць у фінал (гэта Іспанія, Германія, Францыя і Вялікабрытанія), немцы і французы будуць галасаваць за песні другога паўфіналу (там, дзе мы), а іспанцы і англічане — за песні першага.

Сярод сюрпрызаў сёлетняга года — вяртанне да ўдзелу Італіі. Апошні раз ад гэтай краіны на конкурс ездзіў Тота Кутунья, які тады і перамог. Затым, як вядома, Італія адмовілася ад далейшага ўдзелу на карысць італьянскага конкурсу песні ў Сан-Рэма.



### ЛЕНУ І ВІДОВІШЧАЎ!

Чаканай падзеяй стане другі ўдзел у конкурсе немкі Лены Маер-Ландрут, якая перамагла летась. Тады песня Лены была выбраная на адмысловым праекце «Наша зорка для Осла», якую транслявалі па ўсёй Германіі. Сёлета немцы будуць выбіраць не зорку, а песню для зоркі. Назва новага праекта — «Наша песня для Германіі». Перадача стартуе 31 студзеня і будзе змяшчаць у сабе тры выпускі. У першых двух публіцы будзе прадстаўлена 12 кампазіцый, лепшыя з якіх пройдуць у фінал шоу. На ім падчас галасавання немцы і назавуць песню, з якой Лена другі раз будзе штурмаваць песенны п'едэстал. Адбудзецца гэта 18 лютага.

Вядомыя ўжо і вядучыя. Весці «Еўрабачанне-2011» будуць трое вядучых: журналістка Анке Энгелькe, вядучая нямецкіх тэленавін Юдзіт Ракерс і прадстаўнік шоу-бізнэсу Штэфан Рааб, які летась прадзюсаваў Лену Маер-Ландрут.

У Esprit-Arena ў Дзюсельдорфе арганізатары чакаюць каля 35 тысяч гледачоў, падчас трансляцыі Еўрапейскі вяшчальны саюз паспрабуе зацікавіць яшчэ 120 мільёнаў тэлегледачоў па ўсёй Еўропе і за яе межамі.

**Ілья ЛАПАТО.**

**Жараб'ёўка вызначыла выступленне краін наступным чынам:**

**Першы паўфінал**: Албанія, Арменія, Фінляндыя, Грузія, Нарвегія, Польшча, Расія, Сербія, Швейцарыя, Турцыя

**Другая частка першага паўфіналу**: Азербайджан, Харватыя, Грэцыя, Венгрыя, Ісландыя, Літва, Партугалія, Сан-Марына

**Другі паўфінал**: Аўстрыя, Бельгія, Боснія і Герцагавіна, Кіпр, Малдова, Славакія, Швецыя, Нідэрланды, Украіна

**Другая частка другога паўфіналу**: Беларусь, Балгарыя, Данія, Эстонія, Македонія, Ірландыя, Ізраіль, Латвія, Румынія, Славенія.

***P.S.*** *Днямі была названая таксама краіна, якая прыме сёлета дзіцячае «Еўрабачанне». Гэта будзе Арменія. Папярэдняя дата конкурсу — 3 снежня 2011 года.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Открытый аукцион (далее – аукцион) по продаже объекта республиканской собственности состоится «25» февраля 2011 г. в 11.00 в офисе филиала «Медицинская техника» по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 62.**

**Организатор (продавец) аукциона: филиал «Медицинская техника» УП «Белмедтехника», г. Минск, ул. М. Богдановича, 62, конт. тел. (8017) 334 82 24, 334 99 00.**

**НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЕТСЯ:**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона | Сумма задатка (рублей) и реквизиты расчетного счета |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль «Фольксваген LT25» | Год выпуска – 1996; объем двигателя – 2,5 дизель, тип фургона – грузовой вагон, цвет – белый | 5 226 528 | 522 600 рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3012741399017 в отделении 539 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск МФО 153001739, УНП 102300978, получатель – филиал «Медицинская техника» УП «Белмедтехника» |

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения. Предмет аукциона может быть снят с аукциона по решению Организатора (продавца) аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 62, по рабочим дням с 10.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – «24» февраля 2011 года.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона, обязан возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона.

Осмотр предмета аукциона участниками аукциона производится Продавцом.



# ЗАДУБСКІЯ ПТУШКАЛЮБЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Страусіны самец быў вельмі агрэсіўны, ламаў агароджу і ўцякаў з двара. Я баяўся, каб ён не пабіў каго з вяскоўцаў і перавёз птушак да фермера пад Баранавічамі.

Сідарэвіч хацеў займацца агратурызмам, але для гэтага патрэбны добрыя грашовыя ўкладанні. А адкуль яны ў сацыяльнага работніка? Каб прымаць людзей, неабходна стварыць самыя неабходныя ўмовы для пражывання. Сяргей гэтую ідэю не адмятае, але і не развівае яе. Быццам чакае больш спрыяльнага часу. Можа, калі сыны падрастуць? Ён чуў, што ў раёне ўжо створаны турыстычны маршрут: Ганцавічы — Люсіна (мясціны Якуба Коласа) — Задуб'е (птушыная ферма) — лясныя азёры. На думку Сяргея, ідэя гэтая нядрэнная, але і ў раёне павінны дбаць, каб яна нарэшце запрацавала. Грошы, якія ў Сяргея з'яўляюцца, ён траціць на набыццё новых відаў птушак, на корм.

— На зіму маёй птушынай гаспадарцы трэба не менш чым тры тоны зерня, — удакладняе гаспадар. Ён нават дакладна не ведае, колькі ў яго сёння на падворку птушак.

— Ніколі не лічыў, бо гэта для мяне неістотна. А вось птушыных вальераў (*Сяргей пачынае загінаць пальцы)* — атрымліваецца дванаццаць.

Яшчэ ён спрабуе пералічыць сваіх фазанаў: каралеўскі, срэбны, лімонны, залаты, румынскі, паляўнічы. Не кожны заапарк можа пахваліцца гэткай фазанавай калекцыяй. Птушкі нятанныя, але



грошай на іх Сідарэвіч не шкадуе, бо сапраўды ёсць на што паглядзець і чаму здзівіцца. Расфарбоўкі ў гэтых птушак проста неверагодныя. Нават фанабэрысты сіне-перламутравы паўлін у параўнанні з імі не выклікае вялікай цікавасці. Нядаўна завёў кітайскую качку — мандарынку. Зноў жа купіўся на незвычайную расфарбоўку. Гусі, куры, качкі, хоць яны таксама нетутэйшага паходжання, на фоне заморскай ярка-стракатай экзотыкі не падаюцца такімі цікавымі. Што казаць пра паштовых галубоў, лебедзяў і процьму лясных птушачак. Але на гусака-казарку гаспадар не мог не звярнуць увагі:

— Гэта ахова майго падвор'я. Калі ў курачак ці качак, напрыклад, з'яўляецца маладняк, казарка выконвае ролю вартаўніка і кіруе парадкам. Хацеў бы да пары набыць яшчэ і гуску, але вельмі дарагая птушка, і таму мая казарка халасцякуе.

Карова, конь, козы і авечкі, трусы і парсючкі — жывёлы, без якіх сялянская гаспадарка нібы несапраўдная. На заапаркавым падворку Сідарэвічаў у іх роля малапрыкметная, быццам бы пабочная. Але ж з ёю клопатаў не менш, калі не больш. І клопат гэты — усёй сям'і: жонкі Алы — начальніка Задуб'еўскага паштовага аддзялення, сыноў Мішы і Жэнькі, дарэчы навучэнцаў ПТВ будаўнікоў, якія кожныя выхадныя прыязджаюць да бацькоў. І самага меншага — шасцігадовага Кірыла, якому налета ў школу.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Ганцавіцкі раён.*



Качка-мандарынка.



Срэбны фазан.

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Па гарызанталі:** Капенгаген. Жарэс. Ажына. Букет. Ідал. Рыдван. Мука. Піза. Акт. Мір. Парыж. Апал. Кіт. Авал. Код. Скаба. Жакан. Апала. Каляндар. Муза. Азу. Кар. Праснак. Неба. Атара. Карат. Дно. Сыта. Алгебра. **Па вертыкалі:** Рэклама. Казка. Джаз. Апак. Тэатр. Макака. Арахіс. Ілі. Апор. Кіжы. Тона. Накат. Аніва. Дыета. Парадак. Бард. Ант. Парана. Сал. Атол. Мопс. Ява. Акын. Карова. Дан. Абраза. Джала. Рукавіца.

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## Акно як рытуальнае месца

**У адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі, акно выконвала злучальную ролю паміж унутранай прасторай жылля і навакольным светам, які не заўсёды быў добразычлівы ў дачыненні чалавека. Зыходзячы з гэтага, акно, як найбольш уразлівая частка будынка, зачынялася двума незвычайнымі экранамі сакральна-магічнай скіраванасці:**

- з унутранага боку гэта былі фіранкі, на якіх меліся «ахоўныя» ўзоры;

- па ўсім перыметры вонкавага боку вокнаў мелася ліштва, якая, дзякуючы складаным знакавым кампазіцыям, выконвала функцыю хатняга абярэгу, а потым ужо дэкаратыўную ролю.

Акно, акрамя свайго галоўнага прызначэння, ва ўсходніх славян атрымала шэраг сімвалічных функцый, якія праяўляліся ў сямейных абрадах і святах гадавога цыклу. У народных павер'ях акно служыла рытуальным выхадам (шляхам) і супрацьпастаўлялася дзвярам. Таму функцыя акна асабліва выразна адлюстраваная ў пахавальным абрадзе.

- У дзень пахавання на акно клалі першы блін — для душы памерлага.
- У народнай творчасці — галашэннях — труну («дамавіну») часта параўноўвалі з хатай, што паслужыла падставай для ўзнікнення традыцыі рабіць у труне невялікую адтуліну — акенца. Убачыць у сне хату без вокнаў — да хуткай смерці.
- Паўсюдна існаваў звычай ставіць на падаконнік чарку з вадой, каб душы памерлых, прыляцеўшы ў родную хату, маглі абмыцца ў гэтай вадзе. Чарку з вадой ставілі на дзявяты, саракавы дзень пасля смерці, праз год у дзень смерці, у іншыя дні памінання.
- Праз акно выносілі «задушных» нябожчыкаў (самазабойцаў, тапельцаў, тых, хто памёр нехрышчоным).
- Калі гаспадары пакідалі хату, вокны неабходна было «зачыніць», як закрывалі вочы нябожчыку. На вокны крыж-накрыж набівалі шырокія дошкі. Такія дзеянні перасцерагалі хату ад нячыстай сілы.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## 21 студзеня

Дзве даты

**1818 год** — нарадзіўся Адам Карлавіч Кіркор, беларускі этнограф, гісторык, археолаг, публіцыст, выдавец. Член-карэспандэнт Імператарскага археалагічнага таварыства (1856), член Рускага геаграфічнага таварыства (1857), Акадэміі навук у Кракаве (1873). Вучыўся ў Магілёўскай і Віленскай гімназіях. З 1849 года — член Віленскага статыстычнага камітэта. У 1850-54 гадах — рэдактар «Памятнай кніжкі Віленскай губерні», у якой публікаваў свае працы па гісторыі і этнаграфіі Літвы і Беларусі. Праводзіў археалагічныя, этнаграфічныя, краязнаўчыя даследаванні ў Віленскай і Мінскай губернях; у Барысаўскім, Вілейскім, Віленскім, Лідскім, Мінскім, Навагрудскім, Ашмянскім паветах. Вывучыў больш за 1000 кургановў. З 1855 года — член Віленскай археалагічнай камісіі, захавальнік Віленскага музея старажытнасцяў, якому перадаў сваю калекцыю археалагічных знаходак. Запісваў ўзоры вусна-паэтычнага народнай творчасці, абрады, звычаі, гульні, танцы, народныя святы беларусаў.



**1506 год** — заснавана швейцарская гвардыя Ватыкана — найстарэйшая сёння армія ў свеце.

Цытата дня:

***«Няма мяжы развіццю чалавецтва, і ніколі чалавецтва не скажа сабе: стой! дастаткова!».***

**Вісарыён Бялінскі (1811 — 1848), рускі літаратурны крытык.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.13 | 16.28 | 8.15 |
| Віцебск — | 8.09 | 16.12 | 8.03 |
| Магілёў — | 8.04 | 16.18 | 8.14 |
| Гомель — | 7.54 | 16.22 | 8.28 |
| Гродна — | 8.27 | 16.45 | 8.18 |
| Брэст — | 8.21 | 16.52 | 8.31 |

### Месяц

***Поўня 19 студзеня. Месяц у сузор'і Льва.***

### Імяніны

***Пр.** Васілісы, Антона, Віктара, Георгія, Емяльяна, Ілы, Міхаіла, Рыгора, Сідара.*

***К.** Агнешкі, Інесы, Аўгуста, Людвіка, Яраслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.






**МТС — аграрным гарадкам**

# БОЛЬШ ЗА 3,5 ТЫСЯЧЫ КІЛАМЕТРАЎ ПА БЕЛАРУСІ

Цікава, а якой бачыцца Беларусь замежным грамадзянам? Асабліва глыбінка, аграрныя гарадкі, пра якія мы расказваем у нашай пастаяннай рубрыцы, якая выходзіць пры падтрымцы аператара нумар адзін па аказанні мабільных паслуг — МТС. З МТС, безумоўна, пра межы і вялікія адлегласці можна забыць. Увесь свет з табой побач, калі МТС — твой аператар.

Усе вобласці Беларусі праехалі ўдзельнікі міжнароднага аўтапрабегу працягласцю больш за 3,5 тысячы кіламетраў — грамадзяне Расіі і Украіны. І шчыра здзіўляліся высокай якасці беларускіх дарог, чысціні ў гарадках, вёсачках. Уразіў і шчыры, цёплы прыём. Вядома, беларусы — вельмі гасцінныя людзі. Аграрныя гарадкі ўразілі гасцей усімі неабходнымі выгодамі і інфраструктурай, не горшай чым у буйных гарадах.

Жыхары Піцера, Масквы — удзельнікі аўтапрабегу, з якімі пагутарыў аўтар гэтых радкоў, дзяліліся прыемнымі эмоцыямі ад убачанага. Таксама было прыемна пачуць з вуснаў жыхароў расійскіх мегаполісаў цёплыя словы пра Беларусь. Энтузіясты — прадстаўнікі розных прафесій, заняткаў, узростаў — прыехалі ў Беларусь на сваіх аўтамабілях. Калона машын, упрыгожаных слоганам «За Беларусь!», адправілася ў доўгі шлях з расійскага Санкт-Пецярбурга ад беларускага дыпламатычнага прадстаўніцтва.

**Палкоўнік запасу Уладзімір Іванавіч Шандароў, жыхар Санкт-Пецярбурга**, быў самым старэйшым удзельнікам акцыі, яму ўжо пяцьдзясят. Цікава, што падчас падарожжа па Беларусі, у Брэсце, ён нечакана для сябе пры дапамозе добрых людзей атрымаў магчымасць азнаёміцца з асабістай справай свайго дзеда, які ваяваў у Беларусі.

«Я таксама ваяваў — у Афганістане з 1983-га па 1985 год, — расказвае гэты сціплы і вельмі добры чалавек. — 80-я асобная мотастралковая брыгада, месцам дыслакацыі якой быў вядомы Кандагар. Быў камандзірам узвода ў дэсантна-штурмавым батальёне. За баявыя дзеянні ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу». Некаторых удзельнікаў аўтапрабегу ведаю даўно — яшчэ з савецкіх часоў, з некаторымі пазнаёміліся толькі па шляху. Знаёмыя патэлефанавалі і прапанавалі паехаць у Беларусь. Я, вядома ж, адразу даў згоду. Тым больш што палова маёй радні жыве ў Беларусі. Заехалі ў Брэсцкую крэпасць. Дзед там ваяваў. Памёр ён, на жаль, гадоў дзесяць таму. Жыў у Смаленскай вобласці. Там і мама мае жыве зараз у Ярцава. У крэпасці, зразумела, захацелася нешта разведаць пра дзеда. Памятаю, часта яго запрашалі ў крэпасць на сустрэчы. Ды ў апошнія гады жыцця цяжка ён хварэў. Фота сярод экспанатаў музея не знайшоў. Экскурсавод сказаў, што пашукаюць. І вось выдалі асабістую справу. Дазволілі нават сфатаграфаваць старонкі»...

Паважаны суразмоўца вельмі ўдзячны за дапамогу. Паводле ягоных слоў, у Беларусі яму вельмі спадабалася. Чысціня паўсюль, парадак, людзі гасцінныя. У такой краіне хочацца застацца жыць. «Людзі ў Беларусі добрыя: па вачах відаць адразу, рады знаёмству, прымаюць душэўна не для гульні ў гасціннасць, а ад душы... Памятаю, калі яшчэ бабуля жыла ў Беларусі, трымала гаспадарку, то рабіла сама каўбасу. І цяпер — не па чутках ведаю — у Беларусі прадукты вырабляюцца высокай якасці. Дык хачу дамоў купіць пра запас прадуктаў натуральных, сапраўдных, якасных. Парадаваць родных беларускім сырам, каўбасой і гэтак далей»...



Палкоўнік запасу ўпэўнены, што народы па-ранейшаму разумеюць адзін аднаго, дзяліць нам няма чаго.

Як паведаміў **Сяргей Харланцьеў, старшыня грамадскага аб'яднання «Браты-славяне» (Санкт-Пецярбург),** арганізацыя аб'ядноўвае грамадзян Расіі, Беларусі, Украіны. Усяго ў аўтапрабегу, мэта якога падтрымаць сяброўства і саюз, аб'яднанне славянскіх краін, бралі ўдзел дзясяткі чалавек. Па дарозе далучылася нават сям'я з немаўлём. У гарадах, пасёлках сустракаліся з прадстаўнікамі грамадства, ускладалі кветкі і вянкі да помнікаў героям вайны. Такім чынам наведалі мноства беларускіх гарадоў.

**Аляксей Дорменеў, старшыня «Аўтарадыё-клуба» (Санкт-Пецярбург) і сустаршыня руху «Браты славяне»,** расказаў мне, што ідэя правесці прабег прыйшла з глыбіні душы.

«Нам хочацца, каб паміж Расіяй, Беларуссю, Украінай не было непаразумення, каб мы сябравалі. У нас агульная гісторыя, шмат нас аб'ядноўвае, — расказвае Аляксей. — Я не першы раз у Беларусі. Упершыню быў яшчэ напрыканцы 1980-х, і потым яшчэ некалькі разоў... Відаць, як развіваецца беларуская глыбінка. І аграрныя гарадкі будуюць, і гарады прыгажэюць».

Аляксей нарадзіўся ў Маскве. Ён мае ажно тры вышэйшыя адукацыі. «Аўтарадыё-клуб» яднае сацыяльна актыўных людзей, якія абменьваюцца інфармацыяй пра стан дарог, заторы...

**Прадпрымальнік з Масквы Марат** (прозвішча не назваў, бо адзначыў, што ён звычайны чалавек, які шчыра паважае беларускі народ) падчас нашай размовы перыядычна гаварыў пра тое, што добра было б застацца жыць у нашай краіне: дарогі, як у Еўропе, людзі гасцінныя, цэны ў крамах прывабныя і тавары якасныя...

«Дык заставайцеся, наладзьце бізнэс у Беларусі. Чаму б не памяняць Маскву на той жа Мінск? А мо і пасяліцца ў правінцыі», — прапанаваў яму. Абяцаў падумаць.

А нам, грамадзянам Беларусі, думаць трэба над тым, як зрабіць наш агульны дом яшчэ больш утульным, прывабным, каб гасцям было яшчэ больш чаму здзіўляцца. Пастараемся ад душы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Усміхнемся

**Хітрае немаўля даплаціла буслу, які нёс яго, 200 баксаў і стала грамадзянінам Швецыі.**

☺

Муж размаўляе па тэлефоне:

— Не ведаю, тэлефануйце ў бюро надвор'я!

— Хто тэлефанаваў? — пытаецца жонка.

— Напэўна, нейкі марак. Пытаўся, як там на гарызонце?

☺

**Чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе дворнік са стрэльбай.**

☺

Дзве сяброўкі.

— Ну, я яму і кажу: «Саша, каханы, ты што, пакрыўдзіўся?»

— А ён?

— А ён Сярожа...



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і рэдагуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 320. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12